- Обновлено 26.05.2020 13:01
Опубликовано 26.05.2020 11:55
Автор: ОПРИиОС
Просмотров: 469

Курсанты першага курса факультэта міліцыі паўдзельнічалі ў выніковым этапе міжнароднага конкурсу, які праводзіўся з нагоды святкавання 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Арганізатарам конкурсу выступіў Міжнародны адукацыйны гісторыка-культурны інтэрнэт-праэкт «Гісторыя Дзяржавы Расійскай» пры падтрымцы вядучых ваенна-гістарычных музеяў Масквы. Мэтай конкурсу было прыцягненне ўвагі моладзі да подзвігаў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

Курсанты інстытута адказвалі на пытанні аднаго з блокаў конкурсу – алімпіяды. Спаборнічаць давялося з 677 удзельнікамі з Расіі, Беларусі, Данецкай Народнай Рэспублікі і нават далекай Гвінеі. І усе тры прадстаўнікі інстытута сталі пераможцамі: у **Андрэя Плісікава** – першы абсалютны вынік, **Мікіта Барадулін** стаў другім у абсалютным заліку, **Аляксандр Шавека**, крыху саступіўшы калегам па балах, таксама ўвайшоў у лік пераможцаў. Кіраваў падрыхтоўкай курсантаў да конкурсу **Антон Ігнатовіч** – дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.



Phoca PDF